## Круглый стол «Гегель и гегельянство: история, рецепции, критика», посвященный 250-летию со дня рождения Г. В. Ф. Гегеля и 200-летию публикации «Философии права» («Grundlinien der Philosophie des Rechts»)

# СТАНАЎЛЕННЕ НАВУКІ СУЧАСНАГА ТЫПУ І ФІЛАСОФІЯ ГЕГЕЛЯ

*А. І. Бабко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Філасофія Гегеля ўяўляе сабой глыбокую, сістэматычна распрацаваную рэакцыю на грунтоўна важныя для канстытуявання культуры Новага часу працэсы. Таму вывучэнне згаданага духоўнага феномена дазваляе дакладней і выразней выявіць існасць грамадства, што паўстала ў выніку Вялікай французскай рэвалюцыі, а даследаванне падзей, што ў ім адбываліся, рухае наперад засваенне гегелеўскай тэарэтычнай спадчыны. Дадзеная тэза мае моц і ў адносінах да станаўлення навукі сучаснага тыпу. Гегель глыбока асэнсаваў згаданы працэс, і ў яго сістэме знаходзяць арыгінальнае вырашэнне супярэчнасці, якімі ён быў адзначаны. Разам з тым у адпаведным яе сегменце ўвасабляецца пэўны – важны і сёння – тып філасофскага бачання навуковага пазнання і яго ўзаемадзеяння з філасофіяй.

Як было згадана вышэй, узнікнне навукі сучасага тыпу мела драматычны, супярэчлівы характар. Антыдагматычная па сваёй сутнасці і скіраваная да паслядоўнай рэалізацыі высокага ідэалу свабоды мыслення, яна з самага пачатку свайго фарміравання сутыкнулася з асвечанымі даўняй традыцыяй уяўленнямі і іх носьбітамі, калектыўнымі (інстытуцыяналізаванымі) і індывідуальнымі. Адпаведныя калізіі не былі, аднак, толькі знешнімі (Новае ніколі не паўстае адразу ў чыстай і развітай форме. Дадзены момант артыкулюецца і ў гегелеўскай сістэме: новы этап у разгортванні пэўных працэсаў, новая катэгорыя ці з’ява заўсёды разглядаецца ў ёй як істотна абцяжараная спачатку старым зместам, які павінен быць пераадолены праз далейшае развіццё.). Так і прыхільнікі новай навукі мусілі прайсці праз сумненні, моманты няўпэўненасці, праз драматычнае ўнутранае змаганне (Яскравы прыклад такога стану спраў падаюць пакутлівыя ваганні Мікалая Каперніка, які ясна ўсведамляў і востра перажываў недастатковасць аргументаў на карысць

геліяцэнтрычнай астранамічнай мадэлі, марудзячы з публікацыяй вынікаў сваіх даследаванняў. Дадзеная акалічнасць належыць да падстаў для адмаўлення рэвалюцыйнага статусу тэарэтычнага даробку вялікага польскага астранома, якое мае месца ў працах некаторых гісторыкаў навукі [1, с. 63; 2, с. 76–77].). Кожны крок наперад у пераадоленні дагматычных уяўленняў даваўся новай навуцы цяжка, выклікаючы часам непаразуменні нават паміж тымі, хто шчыраваў на яе ніве (Галілей, напрыклад, у згодзе са шматвекавой традыцыяй не прыняў адкрыццяў Кеплера, паводле якіх планеты рухаюцца нераўнамерна і па эліптычных арбітах [3, с. 299]). Момант нявыспеласці, непаслядоўнасці хаваўся і ў самой існасці ранніх гістарычных увасабленняў навуковага пазнання сучаснага тыпу, якія былі ў канчатковым выніку сінтэзаваны ў механічнай карціне свету. Адзначаныя пошукам іманентных законаў прыроды, выяўленне якіх павінна кантраляваццa досведам, яны суправаджаліся разам з тым стварэннем «надбудовы», якая грунтавалася на прынцыпе трансцэндэнталізму (Ілья Прыгожын і Ізабель Стэнгерс даводзяць, што ўяўленне пра прыроду як дасканалы механізм з неабходнасцю падштурхоўвала да ідэі трансцэндэнтнага Бога, які стварыў яго і даў штуршок яго функцыянаванню [4, с. 46]).

Калізія тыпаў светабачання, ў якіх увасабляюцца ідэі іманентнасці ці яе супрацьлеглага адпаведніка, не была і не магла быць асэнсаванай ва ўсёй сваёй паўнаце у межах навуковага пазнання (яна была проста «абясшкоджаная» пры дапамозе дэістычных ідэй, што адкрывала шлях для далейшага разгортвання навуковых даследаванняў). Развязаць адпаведны канфлікт магла толькі філасофія, і ў Гегеля мы знаходзім дыялектычны варыянт такой развязкі. Хоць катэгорыі іманентнасці і трансцэндэнтнасці не належаць да ключавых у слоўніку філосафа, яны з'яўляюцца надзвычай эфектыўным інструментам тэарэтычнай рэканструкцыі яго сістэмы. Творчы першапачатак разглядаецца ў ёй як іманентны свету, аднак яго іманентнасць уключае ў сябе момант саматрансцэндавання: Бог выступае як сапраўдны толькі ў выпадку сваёй самарэалізацыі, толькі ў працэсе ўсталявання «свайго іншага» [5, с. 24], г. зн. у працэсе выхаду за свае межы, які азначае разам з тым вяртанне да сябе праз усё больш поўнае самаўвасабленне ў іншым, якое робіцца сапраўды «сваім». Гегель сінтэзуе, значыцца, іманентызм і трансцэндэнталізм, робячы асновай згаданага сінтэзу ідэю іманентнасці.

Згаданы падыход цалкам адпавядае духу і сэнсу працэсаў, што разгортваліся на той час у духоўным жыцці чалавецтва (у тым ліку і ў сферы навуковага пазнання) і што разгортваюцца ў сучасных умовах (ён быў высока ацэнены і задзейнічаны ў нашай філасофскай культуры Міколам Крукоўскім [6]). У ім яскрава выяўляецца і гегелеўская мадэль арганізацыі дачыненняў паміж філасофіяй і навукай: голас філасофіі павінен загучаць тады, калі навука дасягае сваіх межаў і сутыкаецца з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблемамі, што пераўзыходзяць яе магчымасці. Мысляр прызнаваў вяршэнства філасофіі ў сферы чалавечага пазнання, што не зрабілася ў яго, аднак, падставай для пыхлівага стаўлення да навукі. Сапраўды, з даведзенага вышэй адназначна вынікае, што навуковае пазнанне з'яўляецца аўтаномным у межах сваёй кампетэнцыі (калі Гегель і крытыкаваў пэўныя навуковыя тэорыі, дык адпаведныя крытычныя заўвагі грунтаваліся на наяўных у іх, на яго думку, канцэптуальных хібах [7, с. 196]). У выніку гегелеўскае бачанне ўзаемадачыненняў філасофіі і навукі набывае ўзважаны, памяркоўны характар: яно ўнікае аднабаковых, радыкальных пунктаў гледжання (сцыентызму і антысцыентызму), ствараючы надзейны падмурак для плённага ўзаемадзеяння абодвух тыпаў пазнавальнай дзейнасці.

Такім чынам, у распрацаванай Гегелем сістэме мы знаходзім адэкватную філасофскую рэакцыю на ўзнікненне навукі сучаснага тыпу, якая і ў сучасных умовах не страціла актуальнасці ў плане асэнсавання і эфектыўнай арганізацыі ўзаемаадносін паміж філасофскім і навуковым пазнаннем. Больш за тое, ідэя глыбокага і рухомага адзінства іманентнасці і трансцэндэнтнасці творчага першапачатку ў прыродзе і грамадстве мае грунтоўнае значэнне для духоўнага жыцця (калектыўнага і індывідуальнага) увогуле, што мусіць быць, аднак, тэмай іншага даследавання.

## Літаратура і крыніцы

1. Cohen, I. B. Les origins de la physique modern / I. B. Cohen. – Paris: Éditions du Seuil, 1993. – 285 p.

2. L'Europe de science: constitucion d'un espace scientifique / sous la dir. de M. Blay, E. Nicolaïdis / M. Assimakopoulos, M. Beretta, M. Blay H. F. Cohen, M. Gally et otr. – Paris: Éditions du Seuil, 2001. – 437 p.

3. Schmutzer, E. Galilei, Galileo / E. Schmutzer. // Philosophenlexikon // hrsg. von E. Lange und D. Alexander. – 4 Aufl. – Berlin: Dietz Verlag, 1987. – S. 297–301.

4. Prigogine, I. Order out of Chaos: Man's New Dialogue with Nature / I. Prigogine, I. Stengers. – London: Flamingo, 1985. – XXXI, 349 p.

5. Гегель, Г. В. Ф. Философия природы // Энциклопедия философских наук: в 3 т. – М.: Мысль, 1975. – Т. 2. – 695 с.

6. Крукоўскі, М. І. Бляск і трагедыя ідэалу: Філасофскія эцюды пра ідэалы, дэмакратыю і суверэнітэт / М. І. Крукоўскі. – Мінск: «Беларускі кнігазбор», 2004. – 352 с.

7. Inwood, M. A Hegel Dictionary / M. Inwood. – Oxford: Wiley, 1992. – 356 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ